Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці
Кафедра культуралогіі

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
культуралогіі

_________А.І. Смолік
«19» 12 2022г.

УЗГОДНЕНА
Зам. дэкана факультэта
культуралогіі і
сацыяльна-культурнай
дзейнасці
_________Г.М. Стэльмах
«26» 12 2022г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# АХОВА НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ І ФАЛЬКЛОРУ

*для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

Складальнік:
Лабачэўская Вольга Аляксандроўна, доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці
26 12 2022 г., пратакол № 5

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

*Т. І. Кухаронак, старшы навуковы супрацоўнік аддзеда народазнаўства Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*

*Л.Л. Ражкова, загадчык кафедры нарадна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук*

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 21.09.2022 г.)

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ………………………………………...4

2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………………….6
2.1 План-канспект лекцый ........................…........................................6

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………………………..10
3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў……………………………………10

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ………………………………..14
4.1 Пералік пытанняў па тэмах семінарскіхх заняткаў …….. ……….14
4.2 Заданні для кантралюемай самастойнай работы ..………………..15
4.3 Пералік пытанняў да заліку………………………………………...17

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ …………………………….................19
5.1 Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне ……………………19
5.2 Рабочы тэматычны план па дысцыпліне ………………………….30
5.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў………...31
5.4 Асноўная літаратура………………………………………………...33
5.5 Дататковая літаратура………………………………………………35

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору абапіраецца на веды, атрыманыя студэнтамі па дысцыпліне “Этнаграфія Беларусі. Фальклор. Міфалогія”.

Першая частка курса дазваляе студэнтам пазнаёміцца з міжнароднымі і айчынным падыходамі, заканадаўча-нарматыўнымі дакументамі і вопытам ў галіне аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, высвятляе яе асаблівасці і спецыфіку. Другая частка прысвечана азнаямленню з элементамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў свеце і ў Рэспубліцы Беларусь, якія узяты пад ахову і уключаны ў Рэпрэзентатыўны спіс ЮНЕСКА і аналізу практыка-метадалагічных падыходаў, накіраваных на ахову нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Змест дысцыпліны прадугледжвае яе выкладанне з улікам існуючай нарматыўна-прававой базы, дасягненняў сусветнай і айчыннай фалькларыстыкі, дасле¬даванняў па асобных праблемах этнаграфіі і фальклору, а таксама навукова-публіцыстычных і навукова-папулярных прац..

Вучэбная дысцыпліна звязана адзінай канцэпцыяй, прынцыпамі адбору і выкладання матэрыялу. Структура дысцыпліны суадносіцца з прынцыпамі гістарызму, вызначаецца адпаведнасцю гістарычнай рэчаіснасці.

*Аб’ектамі вывучэння* з’яўляюцца: нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі у вызначэнні яе, дадзеным ў Канвенцыі “Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны” ЮНЕСКА (2003).

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – ахарактарызаваць сучасны стан аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі як аб’екта аховы, паказаць асноўныя накірункі практычнай дзейнасці ў гэтай галіне і пазнаёміць з пагрозамі яе страты.

*Асноўнымі задачамі* дысцыпліны «Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору» з’яўляюцца:

– перадача студэнтам ведаў пра асноўныя праблемы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі;

– фарміраванне ўласных адносінаў і зацікаўленасці студэнтаў да праблем яе аховы і захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі і іншых краін свету;

– веданне асноўных накірункаў у справе аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі;

– выпрацоўка ўмення высвятляць існуючыя пагрозы яе знікнення і прапаноўваць эфектыўныя метады яе аховы.

– фарміраванне і развіццё культуралагічнага мыслення студэнта праз

засваенне прапанаванага матэрыялу;

– фарміраванне базы для практычнага ўкаранення атрыманых студэнтамі ведаў у прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія адпавядаюць агульным патрабаванням да фарміравання прафесійнай кампетэнцыі студэнта, фарміраванню ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– рэпрадукцыйныя метады (расказ, тлумачэнне, гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў);

– метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі);

– праблемныя (творчы дыялог, назіранне);

– кантрольна-ацэначныя метады.

*Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў* прадугледжвае вывучэнне асобных тэм і раздзелаў дысцыпліны з выкарыстаннем метадычных рэкамендацый і літаратуры, рэкамендаванай выкладчыкам. Кантроль самастойнай работы студэнтаў адбываецца перыядычна падчас аўдыторных заняткаў.

*Студэнт павінен ўмець*:

– прымяняць атрыманыя веды ў кантэксце сваёй прафесійнай дзейнасці;

– выяўляць найбольш дасканалыя элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

– прапаноўваць на практыцы найбольш дзейсныя шляхі іх аховы і захавання;

– карыстацца заканадаўча-нарамтыўнымі дакументамі, навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Вучэбная дысцыпліна « Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору » вывучаецца на працягу аднаго семестра ў аб’ёме 52 гадзін, з якіх 36 гадзін – аўдыторныя заняткі (16 г. – лекцыі, 12 г. – семінары).

Рэкамендуемая форма кантролю ведаў – залік.

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

### *Уводзіны*

Мэта, прадмет і задачы курса “Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору”. Небяспека страты нематэрыяльнай культурнай спадчыны ва ўмовах працэсу глабалізацыі.

Тэарэтычныя і нарматыўна-заканадаўчыя аспекты аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС) і фальклору.

Сувязь курса з іншымі дысцыплінамі беларусазнаўства: этнаграфія, міфалогія, фальклор, культуралогія.

Азначэнне фальклору. Паняцці “фальклор”, “традыцыйная культура”, “нематэрыяльная культурная спадчына”.

Фальклор (ад англ.: folklore) — народная творчасць. Міжнародны тэрмін, якія вызначае народную культуру, ахоплівае ўсе з’явы матэрыяльнай і духоўнай культуры народа (ва ўсім яе аб’ёме і відах). Сінонімы: народная творчасць, народныя традыцыі, вусна-паэтычная творчасць і інш. Уведзены англійскім археолагам Уільямам Джонам Томсанам у 1846 годзе.

Упершыню шырокае вызначэнне тэрміна «фальклор» было дадзена ў Рэкамендацыях аб захаванні фальклору ЮНЕСКА (1989 г.): “Гэта калектыўная і заснаваная на традыцыях творчасць груп ці індывідумаў, якая абумоўлена надзеямі і памкненнямі грамадства; з’яўляецца адэкватным выяўленнем іх культурнай і сацыяльнай самабытнасці; фальклорныя ўзоры перадаюцца вусна, шляхам імітацыі і іншымі спосабамі. Яго формы ўключаюць мову, вусную літаратуру, музыку, танцы, гульні, міфалогію, абрады, звычаі, рамёствы, архітэктуру і іншыя віды мастацкай творчасці”.

У Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА (2003 г.) паняцце “фальклор” заменена паняццем “Нематэрыяльная культурная спадчына”, якое было сфармулявана ў выніку больш шырокага погляду на разуменне межаў і структуры народной творчасці, яе значэння для развіцця культуры і захавання этнічнай, нацыянальнай, а таксама рэгіянальнай і лакальнай самабытнасці асобных народаў і груп.

“Нематэрыяльная культурная спадчына – звычаі, формы ўяўлення і выяўлення, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы артефакты і культурныя прасторы, прызнаныя супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны. Такая нематэрыяльная культурная спадчына, якая перадаецца ад пакалення да пакалення, пастаянна ўзнаўляецца супольнасцямі і групамі ў

залежнасці ад навакольнага асяроддзя, іх узаемадзеяння з прыродай і гісторыяй, і фарміруе ў іх пачуццё самабытнасці і пераемнасці, і гэтым садзейнічае павазе да культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека”.

У адрозненні ад папярэдніх падыходаў і вызначэнняў фальклору і дэфініцыі “нематэрыяльная культурная спадчына” падкрэслены наступныя складнікі: ўяўлення і выяўлення, веды і навыкі; інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы; што яна перадаецца ад пакалення да пакалення, пастаянна ўзнаўляецца супольнасцямі і фарміруе ў іх пачуццё самабытнасці і пераемнасці. Такім чынам нематэрыяльная культурная спадчына з’яўляецца шматфункцыянальнай сістэмай і адлюстроўвае непарыўную сувязь эпох і пакаленняў, залежнасць форм культуры ад навакольнага асяроддзя, якое уладкоўваецца чалавекам па законах культуры. У Канвенцыі найперш акцэнтуецца ўвага на “жывой спадчыне”, якая ўвесь час узнаўляецца і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Патрабаванні Канвенцыі рэгламентуюць, што ініцыятарамі захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны павінны выступаць самі носьбіты традыцыі, прадстаўнікі этнічных супольнасцей і груп.

У заходніх краінах дадзенае паняцце атрымала найбольшае распаўсюджанне як “intangible heritage” – “неасязальная” або “нематэрыяльная” спадчына. Калі браць за аснову дэфініцыю «нематэрыяльны», то яна прадугледжвае перш за ўсё адсутнасць матэрыяльнай (прадметнай) асновы, іншымі словамі, адсутнасць пэўнай фізічнай формы. Размова ідзе пра ўсе аб’екты культуры, якія не выражаны ў апрадмечанай (рэчыўнай) форме – аб духоўнай культуры наогул. Падзел культуры на матэрыяльную і духоўную, прыняты ў этнаграфіі, ўмоўны. Сустракаюцца меркаванні, паводле якіх нематэрыяльную спадчыну атаясамліваюць з традыцыйнай культурай.

Традыцыйная культура (паводле лац. traditio – перадача) – мясцовыя па паходжанні элементы сацыяльнай і мастацкай спадчыны (нормы паводзін, каштоўнасці, ідэі, звычаі, абрады), якія перадаюцца ад пакалення да пакалення і існуюць у супольнасці на працягу доўгага часу з прычыны іх карыснасці для яе самазахавання.

Па вызначэнні Канвенцыі 2003 г. нематэрыяльная культурная спадчына выяўляецца ў наступных галінах:

(а) вусныя традыцыі і формы выяўленыя ўключна з мовай у якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

(б) выканаўчае мастацтва;

(в) звычай, абрады, святы;

(г) веды і звычаі, датычныя прыроды і Сусвету;

(д) веды і навыкі, звязаныя з традыцыйнымі рамёствамі.

Пашыранае талкаванне паняцце нематэрыяльнай культурнай спадчыны, прыняцце Міжнароднай Канцвенцыі “Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны” ў 2003 г. была найперш выклікана праблемамі і пагрозамі небяспека і страты гэтай часткі культурнай спадчыны чалавецтва ва ўмовах працэсу глабалізацыі. Канвенцыя заклікана служыць супрацьдзеяннем пагрозам, якія спадарожнічаюць сёння ў свеце існаванню нематэрыяльнай спадчыны.

Найперш гэта глабілізацыйныя працэсы. “Глабалізацыя – працэс усё больш хуткага сціскання часу і прасторы” (Р. Чепайтене). Прызнакамі і праявамі глабалізацыі з’яўляюцца: інфармацыйная цывілізацыя ці медыя-культура; культурная глобалізацыя, ўніфікацыя і стандартызацыя; дамінаванне візуальнасці; масавая спажывецкая культура, віртуалізацыя (працы, вопыту, зносінаў у прыватнай і сацыяльнай прасторы); дэтэрытарызацыя (аслабленне значэння месца, масавыя міграцыі); новыя тэхналогіі.

Культурная гомагенізацыя (аднастайнасць), да якой вядуць глабалізацыйня працэсы, збядняя свет і супярэчыць агульным законам яго развіцця і існавання. Менавіта культурная дыферэнцыяцыя адлюстроўвае біялагічную і геаграфічную разнастайнасць нашай планеты. Пры гэтым міжкультурнае ўзаемадзеянне і запазычванне элементаў мастацкага самавыяўлення іншых культур – натуральны працэс, які развівае і ўзмацняее культуры. Разам з тым, масавая (папулярная) культура не з‘яўляецца натуральным утварэннем, дзейнічае па іншых законах – паглынае этнічныя, рэгіянальныя, лакальныя культуры. Стандартызацыя, гомагенізацыя культуры праз сродкі масавай камунікацыі і эканамічная глабалізацыя садзейнічае знікненню культурнай разнастайнасці.

Важна адзначыць, што ў свеце побач з глабалізацыяй назіраецца і супрацьлеглы працэс – глокалізацыя. Глакалізацыя (англ.: Glocalisation) - гэта працэс эканамічнага, сацыяльнага, культурнага развіцця, які характарызуецца суіснаваннем рознанакіраваных тэндэнцый: на фоне глабалізацыі замест чаканага знікнення рэгіянальных адрозненняў адбываецца іх захаванне і ўзмацненне. Па-сутнасці – гэта канцэпцыя рэгіянальнага водгуку на працэсы глабалізацыі. Натуральныя працэсы развіцця ідуць адразу ў абодва бакі, глабальнасці і лакальнасці.

Рэспубліка Беларусь была ў шэрагу краін, якія першымі ратыфікавалі Канвенцію 2003 г. З 2004 г. Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА разглядаецца нашай краінай як заканадаўчы акт, які пакладзены ў аснову нацыянальнага заканадаўства па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. У Беларусі немала зроблена для захавання і развіцця

нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Адным з напрамкаў дзейнасці ў гэтай галіне з'яўляецца адукацыя.

Аб'ектамі вывучэння дысціпліны "Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны" з'яўляюцца: нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі у тым вызначэнні яе, якое дадзена ў Канвенцыі "Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны" ЮНЕСКА (2003). Мэта вучэбнай дысцыпліны – ахарактарызаваць сучасны стан аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі як аб'екта аховы, паказаць асноўныя накірункі практычнай дзейнасці ў гэтай галіне і пазнаёміць з пагрозамі яе страты.

Асноўнымі задачамі дысцыпліны «Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору» з'яўляюцца: перадача студэнтам ведаў пра асноўныя праблемы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі; фарміраванне ўласных адносінаў і зацікаўленасці студэнтаў да праблем яе аховы і захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі і іншых крані свету; веданне асноўных накірункаў у справе аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі; выпрацоўка ўмення высвятляць існуючыя пагрозы яе знікнення і прапаноўваць эфектыўныя метады яе аховы; фарміраванне і развіццё культуралагічнага мыслення студэнта праз засваенне прапанаванага матэрыялу; фарміраванне базы для практычнага ўкаранення атрыманых студэнтамі ведаў у прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці.

## Радзел 1 Тэарэтычныя і нарматыўна-заканадаўчыя аспекты аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны

### *Тэма 1. Дакументы ЮНЕСКА і міжнародная практыка па ахове НКС*

Нематэрыяльная культурная спадчына як частка гісторыка-культурнай спадчыны. ЮНЕСКА – міжнародны орган супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і культуры. Напрамкі дзейнасці Нацыянальнай камісіі ЮНЕСКА.

ЮНЕСКА – міжнародная арганізацыя, заснаваная пры Арганізацыі аб'яднаных нацый у 1945 г., якая вызначае стратэгію супрацоўніцтва дзяржаў у галіне адукацыі, навукі, культуры і камунікацыі. Мае высокі міжнародны аўтарытэт і ўплывае на фарміраванне дзяржаўнай палітыкі і ажыццяўляе маштабныя культурныя, адукацыйныя, інфармацыйныя і навуковыя праграмы. Членамі ЮНЕСКА з'яўляюцца 195 дзяржаў-членаў і 8 членаў-супрацоўнікаў. На нацыянальным узроўні дзейнічаюць яе Нацыянальныя камісіі.

У склад ЮНЕСКА Рэспубліка Беларусь уступіла ў 1954 годзе. Нацыянальная камісія прыцягвае да ўдзелу ў мерапрыемствах і праграмах

ЮНЕСКА навуковыя, адукацыйныя інстытуты, інфармуе дзяржаўныя органы і грамадскія аб'яднанні аб магчымасцях міжнароднага супрацоўніцтва, распрацоўвае пазіцыі беларускай дэлегацыі ў органах ЮНЕСКА, удзельнічае у падборы кандыдатаў для работы ў Сакратарыяце, распаўсюджвае інфармацыю аб праграмах і дзейнасці арганізацыі.

Гісторыя фарміравання міжнародных падыходаў за захавання культурнай разнастайнасці ў свеце. Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972). Рэкамендацыі па ахове фальклору (1989).

Ідэя аховы Сусветнай спадчыны ўзнікла ў 1960-я гады. Будаўніцтва Асуанскай плаціны ў Егіпце – пагроза затаплення  водамі Ніла старажытных помнікаў Нубіі, была асэнсавана як пагроза страты гэтых выдатных помнікаў епіпецкай культуры не толькі для Егіпта, а менавіта для ўсяго чалавецтва. ЮНЕСКА ініцыіравала збор сродкаў і выратаванне скальных храмаў, перавоз іх у небяспечнае месца і музеефікацыю. Стварэнне вадасховішча паставіла пад пагрозу знікнення многія помнікі археалогіі, таму была зроблена выратавальная аперацыя пад эгідай ЮНЕСКА, у выніку якой 24 асноўныя помнікі былі перамешчаныя ў больш бяспечныя месцы або перададзены краінам, якія дапамаглі з працамі (Храм Дэбод у Мадрыдзе і Храм Dendur у Нью-Ёрку. ). Гэтая ініцыятыва замацавала новы узровень разумення каштоўнасці сусветнай спадчыны для ўсёй міжнароднай супольнасці і агульначалавечай  адказнасці за яе захаванне.

На гэтай канцэптуальнай падставе ў наступным была распрацавана і прынята Канвенцыя ЮНЕСКА аб ахове Сусветнай прыроднай і культурнай спадчыны (1972 г.). Мэта дадзенай Канвенцыі – выяўленне ў кожнай краіне прыродных і культурных аб'ектаў, якія павінны  быць прадметам аховы ўсяго чалавецтва нашай планеты. Згодна Канвенцыі быў створаны пры ЮНЕСКА Камітэт Сусветнай спадчыны. У Спісе аб'ектаў сусветнай спадчыны (2021 г.) прадстаўлена 167 краін, 1154 помніка агульначалавечай каштоўнасці: з іх 897 – культурныя, 218 – прыродныя, 39 – змешаныя.

Помнікі Беларусі ў Спісе Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА: 1 помнік прыроды –  Белавежская пушча (1992 г.), разам з Польшчай; 2 помніка культуры – Мірскій замак, 16 ст. (2000 г.), Нясвіжскій палаца-паркавы ансамбль, 17 ст. (2005 г.), Геадэзічная Дуга Струве, 19 ст. (2005 г.). Апошняя стваралася з мэтай вызначэння памеру і формы Зямлі, аб'ядноўвае 10 краін свету. Пяць пунктаў размешчаны ў Беларусі.

Наступны важны крок міжнароднай супольнасці ў разуменні каштоўнасці культурнай спадчыны і  выпрацоўцы мер па яе ахове і захаванню – Канвенцыя  ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003). Гэта першы ў гісторыі шматстаронні прававы дакумент, у

якім духоўная спадчына чалавецтва асобных народаў апісываецца як культурная спадчына ўсяго чалавецтва.

Асноўныя палажэнні Канвенцыі. Ключавым паняццем у дакуменце з'яўляецца "ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны", якое абазначае прынясце мер з мэтай забеспячэння жыццяздольнасці гэтай часткі культуры, уключаючы яе ідэнтыфікацыю, дакументаванне, даследаванне, захаванне, абарону, папулярызацыю, павышэнне яе ролі, яе перадачу, галоўным чынам пры дапамозе фармальнай і нефармальнай адукацыі, а таксама аднаўленне разнастайных аспектаў такой спадчыны. Адной з асноўных задач Канвенцыі з'яўляўся пошук найбольш аптымальных шляхоў захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, вырашэнне пытанняў па актуалізацыі і трансляцыі яе ўзораў.

Структура Канвенцыі 2003 г. Дакумент складаецца з некалькіх раздзелаў.

У I раздзеле "Агульныя палажэнні" вызначаны мэты Канвенцыі: (а) ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны; (б) павага да нематэрыяльнай культурнай спадчыны адпаведных супольнасцяў, груп і прыватных асоб; (в) прыцягненне ўвагі на мясцовым, нацыянальных і міжнародным узроўнях да важнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны і яе ўзаемнага прызнання; (г) міжнароднае супрацоўніцтва і дапамога. Дадзены вызначэнне асноўных паняццяў, якія ужываюцца ў дакуменце: "нематэрыяльная культурная спадчына" з пералічэннем галін, у якіх ана выяўляецца, і "ахова".

У II раздзеле "Органы канвенцыі" вызначаны функцыі Генеральнай асамблеі дзяржаў-удзельніц, Міжурадавага камітэта па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, Сакратарыята.

Цэнтральный часткай Канвенцыіі з'яўляецца III раздел "Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны на нацыянальным узроўні", ў якім вызначана роля дзяржаў-удзельніц, якія павінны: (а) прымаць неабходныя заходы для забяспячэння аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, наяўнай на яе тэрыторыі; (б) у межах мер па ахове ідэнтыфікоўваць і вызначаць розныя элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, наяўнай на яе тэрыторыі, пры ўдзеле супольнасцяў, груп і адпаведных неўрадавых арганізацый. Таксама з мэтай аховы прадугледжаны нацыянальныя спісы ці пералікі для забяспячэння ідэнтыфікацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны на яе тэрыторыі, якія належыць рэгулярна абнаўляць.

Важнай пазіцыяй Канвецыі з'яўляецца артыкул, прысвечаны адукацыі, павышэнню дасведчанасці грамадскасці і ўмацаванне патэнцыялу. Згодна менавіта з гэтым артыкулам у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва з 2009 годзе ў праграмы навучання студэнтаў уведена вучэбная дысцыпліна "Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору".

У IV разделе “Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны на міжнародным узроўні” прадугледжаны дзейныя інструменты міжнароднай аховы і падтрымкі каштоўнасцей нематэрыяльнай культуры народаў свету. Гэта ў першую чаргу складанне “Рэпрэзентатыўнага спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва”. Яго мэта: забеспячэнне большай нагляднасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, садзеянне паглыбленню ўсведамлення яе значэння і заахвочвання дыялогу на аснове павагі да культурнай разнастайнасці. Прапановы для ўнясення ў склад Рэпрэзентатыўнага спіса складаюць Камітэту адпаведныя дзяржавы-ўдзельніцы. Спіс рэгулярна абнаўляецца і публікуецца.

Згодна Канвенцыі ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва быў уключаны папярэдні спіс “Шэдэўры вуснай і нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва”, які склдаўся ЮНЕСКА с 2001 г., г.зн. да абвешчаня дадзенай Канвенцыі.

З мэтай ажыццяўлення дзейсных мераў па ахове і падтрымцы нематэрыяльнай спадчыны прадугледжаны “Спіс элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія падлягаюць ахове”.

Трэцім складнікам дзейсных мер у галіне нематэрыяльнай культурнай спадчыны – гэта Міжнародныя праграмы, праекты і мерапрыемствы па ахове спадчыны. Камітэт па сусветнай спадчыны, як выканаўчы орган Канвенцыі, разглядае і зацвярджае заяўкі на аказанне міжнароднай дапамогі, сфармуляваныя дзяржавамі-удзеніцамі, суправаджае ажыцяўленне пазначаных праграм, праектаў і мерапрыемстваў распаўсюджваннем перадавой практыкі ў гэтай галіне.

У V разделе “Міжнароднае супрацоўніцтва і дапамога” прапісаны мэты і магчымыя формы міжнароднай дапамогі, ўмовы яе аказання.

У VI раздзеле “Фонд нематэрыяльнай культурнай спадчыны” вызначаны крыніцы яго фарміравання: (а) узносы дзяржаў-удзельніц; (в) сродкі, асігнаваныя з гэтай мэтай Генеральнай канферэнцыяй ЮНЕСКА; (с) узносы, ахвяраванні або завяшчаная маемасць, якія могуць быць выдзеленыя (і) іншымі дзяржавамі, арганізацыямі і праграмамі сістэмы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, іншым міжнароднымі арганізацыямі, дзяржаўнымі ці прыватнымі органамі ці прыватнымі асобамі; (d) усякіх працэнтных найчэнняў на сродкі на сродкі гэтага фонду; (е) сум збораў і паступленняў ад мерапрыемстваў, арганізаваных на карысць фонду; (f) усякіх іншых сродкаў, прадугледжаных Палажэнем аб фондзе, распрацаваным Камітэтам. Наяўнасць Фонда дазваляе ажыцяўляць мэты Канвенцыі, сбіраць неабходныя матэрыяльная сродкі і накіроваўваць іх на ахову і падтрымку тых з’яў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія патрабуюць тэрміновай дапамогі, вылучаць сродкі фінансавай дапамогі краінам-ўдзельніцам.

Прысутнасць Рэспублікі Беларусь ў спісах нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Рэпрэзентатыўны спіс: Будслаўскі фэст іконы Божай Маці (2019), Лясное бортніцтва (2020), Беларускія практыкі саломапляцення (2022).

Спіс тэрміновай аховы: Калядныя цары в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобл. (2009), Юраўскі карагод в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобл. (2019).

Характарыстыка элемента «Калядныя цары». Гэта віншавальны абыходны абрад, прымеркаваны да «Шчодрага вечара» (13 студзеня). Ён з'яўляецца своеасаблівай праявай лакальнай культурнай традыцыі в. Семежава Капыльскага раёна. Зараз у Семежава пражывае каля 500 чалавек моладзі, якія з'яўляюцца носьбітамі традыцыйнага абраду. Усе астатнія семежаўцы актыўна падтрымліваюць традыцыю.

Абрад змяшчае элементы традыцыйнага калядна-навагодняга карнавалу і народнай драмы «Цар Максіміліян» і сфарміраваўся як своеасаблівае каляднае прадстаўленне, у якім бяруць удзел юнакі і маладыя мужчыны – «цары» і традыцыйныя мясцовыя персанажы «дзед» і «баба». Віншавальны абыходны абрад распачынаецца з наступленнем цемры. Калядоўшчыкі ідуць з запаленымі паходнямі, што надае абраду незвычайную відовішчнасць. «Цары» ходзяць спачатку па хатах тых аднавяскоўцаў, дзе жывуць незамужнія дзяўчаты, а потым – да астатніх. У хаце разыгрываюць невялікае жартоўнае прадстаўленне сустрэчы і бітвы «цароў», пасля чаго з'яўляецца «доктар» і «лечыць» сапернікаў, прапісваючы ім жартоўныя рэцэпты. Пасля прадстаўлення адбываецца традыцыйнае віншаванне гаспадароў хаты і адорванне ўдзельнікаў абыходу.

Абрад з'яўляецца жывой лакальнай традыцыяй і перадаецца вусным шляхам ад пакалення да пакалення. Ён захоўвае ў сучасным выкананні ўсе першапачатковыя элементы і функцыі: сацыялізуючую, камунікатыўную, эмацыянальную, эстэтычную, выхаваўчую, і з'яўляецца яркім прыкладам беражлівых адносін да святочна-абрадавай традыцыі.

Азнаямленне з прыкладамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва з Рэпрезентатыўнага спіса ЮНЕСКА: Тэатр Кабукі, Японія (2005), Армянскі дудук, Арменія (2009).

### *Тэма 3. Стан і праблемы аховы НКС і фальклору ў Рэспубліцы Беларусь*

Нарматыўна-прававая прававая база па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь.

Пасля набыцця Беларуссю незалежнасці ў 1991 г. пытанне аб нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці – адно з самых важных для працэсу

будаўніцтва дзяржавы. Гісторыка-культурная спадчына разумецца як краевугольны камень у працэсе ўмацавання нацыянальнай дзяржавы і ідэнтычнасці беларускай нацыі. З распадам СССР пачалося стварэнне нацыянальнай прававой сістэмы, у тым ліку ў сферы аховы спадчыны. У гэты перыяд палітыка захавання спадчыны вызначалася Міністэрствам культуры. У 1992 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь № 1940-XII аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, у якім асноўны ўпор рабіўся на матэрыяльную спадчыну. Уваходжанне ў сілу Закона азнаменавала стварэнне Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Дзяржаўны спіс). Дзяржаўны спіс – асноўны дакумент рэгістрацыі гісторыка-культурнай спадчыны, які мае асабліваe важнае значэнне для беларускай культуры.

Дзяржаўная палітыка ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны грунтуецца на прынцыпах: прызнанне гісторыка-культурнай спадчыны фактарам развіцця дзяржавы; адказнасці дзяржавы за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны; удзелу грамадзян у ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны: выяўленне матэрыяльных аб’ектаў і нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, якія могуць уяўляць гісторыка-культурную каштоўнасць; наданне матэрыяльным аб’ектам і нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцей; захаванне і аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцей; утрыманне і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей з улікам неабходнасці безумоўнага захавання іх адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей; фінансаванне аховы гісторыка-культурнай спадчыны за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Нематэрыяльныя праявы творчасці чалавека сталі ацэньвацца як спадчына, прыдатная для атрымання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці краіны, толькі ў пачатку 1990-х гг. Далучэнне (ратыфікацыя) Беларусі да Канвенцыі ЮНЕСКА па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2004).

У адрозненні ад некаторых іншых краін – удзельнікаў Канвенцыі ЮНЕСКА 2003 г. у Рэспубліцы Беларусь не існуе заканадаўства, прысвечанага пытанням аховы і захавання асобна нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У нас на заканадаўчым узроўні зацверджаны падыход да нематэрыяльнай спадчыны як складовай частцы гісторыка-культрнай спадчыны. Дзяржаўная палітыка у нашай краіне ў галіне аховы гісторыка-

культурных каштоўнасцей рэгулюецца “Кодексам Рэспублікі Беларусь аб культуры” (2016). Гл. 16 прысвечана дзяржаўнай палітыцы у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Дзейнічае Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (2006). У ім вызначаецца, што ў гісторыка-культурных каштоўнасцях увасоблена сукупнасць найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі.

Гісторыка-культурныя каштоўнасці падзяляюцца на: матэрыяльныя аб’екты (матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці) і нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека (нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці), якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Да матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей адносяцца: дакументальныя помнікі, запаведныя мясціны, помнікі археалогіі, помнікі архітэктуры, помнікі гісторыі, помнікі горадабудаўніцтва, помнікі мастацтва, фіксаваныя нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Сярод іх вылучаюцца некалькі катэгорый: гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь; гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь; гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія незаконна знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь; гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія зніклі ці страчаны пры нявысветленых абставінах; гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца пад пагрозай знішчэння, страты ці знікнення.

Матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці Беларусі падзяляюцца на наступныя 4 катэгорыі: 0 - гісторыка-культурныя каштоўнасці, уключаныя або прапанаваныя да ўключэння ў спіс сусветнай спадчыны; 1 – унікальныя мастацкія, эстэтычныя і дакументальныя аб’екты міжнароднага значэння; 2 – аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны рэспубліканскага значэння; 3 – гісторыка-культурныя каштоўнасці рэгіянальнага значэння.

Да нэматэрыяльных каштоўнасцей залічаюцца комплексныя нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, калі іх змест выяўляецца праз абрады, фальклор (вусную народную творчасць), у склад якіх уваходзяць розныя па свайму характару дзеянні (танцы, песні, іншыя нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека). Згодна п. 3 арт. 96 “Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры” нэматэрыяльныя каштоўнасці падзялюцца на дзве катэгорыі: катэгорыя «А» – гісторыка-культурныя каштоўнасці, поўная аўтэнтычнасць і дакладнасць якіх безумоўныя і нязменныя; катэгорыя «Б» – гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія поўнасцю або часткова

аднаўлены (зафіксаваны) на другасным матэрыяле ці аб'ектыўна з часам могуць змяняцца.

Гісторыка-культурныя каштоўнасці набываюць дзяржаўны статус праз працэдуру ўнясення іх у Дзяржаўны спіс, які вядзецца на падставе Палажэння «Аб парадку вядзення Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь» (2006). Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — спіс аб'ектаў (матэрыяльных і нематэрыяльных ), якія знаходзяцца пад дзяржаўнай аховай Рэспублікай Беларусь. У Дзяржаны спіс уключаны: 5527 аб'ектаў, з іх 94 аб'екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2020 г.).

Паняцце "ахова гісторыка-культрных каштоўнасцей" вызначецца у беларускім заканадаўстве наступным чынам: гэта сістэма арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і (або) іншых мер, накіраваных на выяўленне матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, якія могуць уяўляць гісторыка-культурную каштоўнасць, наданне матэрыяльным і нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці, улік, захаванне, аднаўленне, утрыманне і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей, што ажыццяўляюцца ў мэтах зберажэння і памнажэня гісторыка-культурнай спадчыны.

Працэдура надання гісторыка-культурным каштоўнасцям дзяржаўнага статуса і ўзяццё іх пад ахову дзяржавы.

Пытанні надання дзяржаўнага статуса гісторыка-культурным каштоўнасцям разглядаецца на паседжаннях Рэспубліканскай навукова-метадычнай Рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рада з'яўляецца дарадчым грамадскім органам. У яе склад уваходзяць супрацоўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (намеснік міністра, начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны), аўтарытэтныя спецыялісты ў галіне архітэктуры, археалогіі, этнаграфіі, фальклору і іншых абласцей культуры і навукі.

Задачы і фунцыі Рады: прымае рашэнні аб неабходнасці надання матэрыяльным аб'ектам і нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці або аб адсутнасці неабходнасці надання ім такога статусу; прымае рашэнні аб неабходнасці аднясення гісторыка-культурнай каштоўнасці да пэўнай катэгорыі або аб неабходнасці змянення яе катэгорыі; адабрае або не адабрае навукова-праектную дакументацыю на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях катэгорый, якія могуць

прывесці да істотнага змянення гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей, іх знішчэння, страты ці знікнення.

Працэдура надання статуса нематэрыяльнай культурнай спадчыны:

Крок 1: Любая юрыдычная ці фізічная асоба можа ўнесці прапановы аб наданні матэрыяльнаму аб'екту або нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Для ўключэння нематэрыяльнай спадчыны ў Дзяржаўны спіс запаўняецца заяўка, якая складаецца з намінацыйнай формы, экспертнага заключэння, фота-, відэа- і аўдыёматэрыялаў, якія адлюстроўваюць актуальны стан традыцыі; пісьмовай згоды супольнасці носьбітаў спадчыны. Кожная намінацыя праходзіць двухэтапную экспертызу. На нервам этапе ажыццяўляецца ацэнка спецыялістаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, як правіла, на падставе палявых даследаванняў, і падрыхтоўка экспертнага заключэння. Затым намінацыя аналізуецца з фармальнага боку спецыялістамі аддзела інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і накіроўваецца ў Міністэрства культуры.

Крок 2: Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь накіроўвае ўласніку (уладальніку) аб'екта, а таксама ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган інфармацыю аб разглядзе гэтай прапановы на пасяджэнні Навукова-метадычнай рады;

Крок 3: Навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры РБ кваліфікавана разглядае на пасяджэнні прапановы (ў тэрмін, які не перавышае 30 дзён); па выніках разгляду Рада выдае заключэнне аб адпаведнасці разглядаемага аб'екта крытэрыям, і прымае рашэнне аб унясенні прапановы аб неабходнасці надання яму статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ці пры адмоўным рашэнні дае абгрунтаванне прычын адмовы;

Крок 4: Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь разглядае прапановы аб неабходнасці надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці; зацвярджае рашэнне і надае статус і катэгорыю гісторыка-культурнай каштоўнасці; ці пазбаўляе статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Міністэрства культуры публікуе афіцыйную інфармацыю на сваім вэб-сайце і дасылае дакумент, які пацвярджае ўключэнне ў спіс, мясцовым органам улады.

Адказнасць за вядзенне Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей ускладзена на Мінсітэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Даданне нематэрыяльнай спадчыны ў спіс азначае з'яўленне абавязацельстваў дзяржавы па ахове спадчыны.

Дакумент арганізаваны ў форме спісу, які пастаянна папаўняецца ўзорамі матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчынай. Рэестр уключае кароткае апісанне праяў нематэрыяльнай спадчыны: назву элемента, яго лакалізацыю, катэгорыю, дату і нумар рашэння аб унясенні ў спіс, апісанне супольнасці або носьбітаў, і ў больш пашыраным фармаце – характарыстыку сучаснага стану і інфармацыю аб мерах па ахове, якія прымаюцца.

### *Тэма 4. Дзейнасць устаноў культуры ў рэчышчы аховы НКС і фальклору ў Рэспубліцы Беларусь*

У адпаведнасці з рэкамендацыямі Канвенцыі ЮНЕСКА 2003 г. ў Рэспубліцы Беларусь створаны Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай спадчыны. У артыкуле 12 зазначана: "Для забяспячэння ідэнтыфікацыі з мэтай аховы кожная дзяржава-удзельніца з улікам рэальнай сітуацыі складае адзін або некалькі спісаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, наяўнай на яе тэрыторыі. Такія спісы належыць рэгулярна абнаўляць".

У 2009 г. Беларуссю быў атрыманы грант ЮНЕСКА на тварэнне Нацыянальнага спіса нематэрыяльнай спадчыны. Інвентар размешчаны на інтэрнэт-партале "Жывая спадчына Беларусі", дзе сканцэнтравана таксама іншая інфармацыя аб традыцыйных формах творчасці. У базе дадзеных Інвентара змяшчаецца падрабязнае, больш за 15 параметраў, апісанне асобнага элемента нематэрыяльнай спадчыны. Тэкставая інфармацыя суправаджаецца фотаматэрыяламі і аўдыё- і відэазапісамі, публікацыямі аб элеменце спадчыны.

Беларускі інвентар па сваёй класіфікацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны некалькі адрозніваецтся ад таго, што зафіксавана ў Канвенцыі ЮНЕСКА. У ім элементы нематэрыяльнай спадчыны размеркаваны па 7 наступных катэгорыях:

Выканальніцкія мастацтвы
Вусныя традыцыі і формы выражэння
Светапогляд людзей, міфалогія
Традыцыйныя рамёствы
Традыцыйная ежа
Практыкі захавання
Традыцыйныя цырымоніі.

Даступны пошук не толькі па катэгорыях, але і па абласцях. Акрамя таго, пасля зацвярджэння дзяржаўнага статуса новых элементаў нематэрыяльнай кусторыка-культурнай спадчыны, публікуюцца папяровыя спісы спісы Інвентару.

Мясцовыя ініцыятывы па ўключэнні элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Практыка і праблемы.

Патрабаванні Канвенцыі рэгламентуюць, што ініцыятарамі захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны павінны выступаць самі носьбіты традыцыі, прадстаўнікі этнічных супольнасцей і груп. Канвецыя 2003 г. прадугледжывает непасрэдны ўдзел мясцовых супольнасцей у гэтай справе. У артыкуле 15 зазначана: "У рамках сваёй дзейнасці па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны кожная дзяржава-ўдзельніца імкнецца забяспечыць па магчымасці самы шырокі ўдзел супольнасцяў, груп, асобных людзей, якія займаюцца стварэннем, захаваннем і перадачай такой спадчыны, а таксама актыўна прыцягваць іх да кіравання такой спадчынай".

У нашай кране выяўленнем каштоўных элементаў нематэрыяльнай культуры, падрыхтоўкай дакументаў па ўнясенню іх ў Дзяржаўны спіс пераважна займаюцца мясцовыя органы і ўстановы культуры на абласным і раённым узроўні, якія працуюць у контакце з супрацоўнікамі Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры, экспертамі з іншых вучэбных і навуковых устаноў.

Сярод грамадскіх арганізацый заангажавана ў справе захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» (СЭТ), якое акрэдытавана пры ЮНЕСКА ў статусе эксперта па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. СЭТ ладзіць уласныя экспедыцыі, назапашвае навуковых архіў, выступае экспертам і актыўным папулярызатарам нематэрыяльнай культуры, патраніруе і маніторыць на працягу гадоў некалькі элементаў: Гульня "Жаніцьба Цярэшкі" ў Лепельскім раёне і "Купалле" ў в. Свяціца Полацкага раёна Віцебскай вобласці, Абрад "Мікольская свяча" ў в. Новая Слабодка Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці і іншыя. Для перадачы традцый выканальніцках мастацтваў (спевы, танцы), тэхналогій рамёстваў СЭТ ладзіць летнікі для моладзі ў цэнтрах захавання традыцый, майстар-класы, гурткі.

Арганізацыі належыць ініцыятыва стварэння Грамадскай каардынацыйнай рады па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (прынята рэзалюцыяй семінара «Нематэрыяльная культурная спадчына: стан, формы і метады аховы», Мінск, 08.04.2012). Задачы Грамадскай каардынацыйнай рады: каардынацыя дзейнасці недзяржаўных арганізацый, мясцовых супольнасцяў і экспертаў па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны; распрацоўка стратэгіі і эфектыўных методык аховы; уплыў на дзяржаўную палітыку ў галіне культуры і аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Уключэнне ў Дзяржаўны спіс і Інветар новых элементаў выклікае цікавасць да з’явы жывой культуры на мясцовым, рэгіянальным і нацыянальным узроўнях. Носьбіты спадчыны запрашаюцца для дэманстрацыі сваіх уменняў шырокай аўдыторыі - на канцэртах, фестывалях, кірмашах. У гэтых умовах прасторава-часавае вымярэнне традыцыйнай нематэрыяльнай з’явы змяняецца, што спрыяе распаўсюджванню ведаў аб спадчыне, а часам і з’яўленню магчымасці заробку для носьбітаў, яны могуць адчуць сябе каштоўнымі для грамадства і рэалізаванымі ў ім.

Тым не менш існуюць пэўныя праблемы з практыкай уключэння элементаў нэматэрыяльнай спадчыны і іх аховы. Напрыклад, пасля ўключэння ў Дзяржаўны спіс маніторынг нематэрыяльных праяў культуры праводзіцца спарадычна. Па гэтай прычыне ў спісе ёсць некалькі пазіцый – арыгінальных і каштоўных прыкладаў народнай творчасці – прысутнасць якіх там выклікае сумнеў, а менавіта: творчасць Мікалая Тарасюка па стварэнні інсітнай драўлянай скульптуры з вёскі Стойлы Пружанскага раёна і казачная традыцыя Уздзеншчыны ў рэпрэзентацыі Лідзіі Цыбульскай. Супярэчнасць звязана з тым, што дадзеныя элементы не адпавядаюць базавым характарыстыкам нематэрыяльнай спадчыны, указаным у Канвенцыі 2003 г., паколькі ў цяперашні час носьбіты гэтай спадчыны не жывуць, а, як вядома, нематэрыяльная спадчына не можа існаваць (быць «жывым») без т. н. сацыяльнай базы, таксама як і ў адсутнасці пераемнікаў, якія б працягнулі ўвасабляць гэтыя навыкі і веды. Прыклады сведчаць аб пакудь яшчэ пэўнай недасканаласці навука-метадалагічных і практычных падыходаў у справе інвентарызацыі, аховы і захавання нэматэрыяльнай культурнай спадчыны ў нашай краіне.

Каштоўным з’яўляецца вопыт іншых краін. Напрыклад, Расія не ратыфікавала Канвенцыю на дзярждаўным узроўні, але праводзіць значную працу па выяўленні нематэрыяльных культурных коштоўнасцей, складае іх Электронныя каталогі на дзяржаўным і рэгіянальных (па абласцях) узроўнях з улікам шматэнічнасці насельніцтва краіны. 2022 г. у Расіі быў абвешчаны годам Годам народнага мастацтва і нематэрыяльнай культурнай спадчыны народаў РФ, распрацавана Канцэпцыя захавання і развіцця традыцыйнай народнай культуры і нематэрыяльнай культурнай спадчыны народаў Расіі, быў зацверджаны федэральны закон “Аб нематэрыяльным этнакультурным здабытку Расійскай Федэрацыі” (20.10.2022).

У лістападзе 2022 г. у Мінску быў праведзены Міжнародны навукова-практычны семінар “Захаванне нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны стран СНГ у ікантэксце глабальных выклікаў”. Надрукаваны матэрыялы семінара, у якіх абагулены вопыт у гэтай галіне Казахстана,

Таджыкістна, Узбекістана, Арменіі, Расіі, а таксама установ культуры Беларусі.

## Раздзел II Практыка-метадалагічны аспект аховы НКС і фальклору

### *Тэма 5. Вусныя традыцыі і выканаўчае мастацтва*

Канвенцыя 2003 г. вылучыла наступныя галіны нематэрыяльнай культурнай спадчына:

(а) вусныя традыцыі і формы выяўленыя ўключна з мовай у якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

(б) выканаўчае мастацтва;

(в) звычай, абрады, святы;

(г) веды і звычаі, датычныя прыроды і Сусвету;

(д) веды і навыкі, звязаныя з традыцыйнымі рамёствамі.

У адпаведнасці з гэтай класіфікацыяй мы будзем разглядаць галоўныя відавыя характарыстыкі нематэрыяльнай культурнай спадчыны і знаёміцца з канкрэтнымі яе прыкладамі з Рэпрэзентатыўнага спіса ЮНЕСКА і Інвентара Беларусі. Такі падыход дазволіць пашырыць базавыя веды студэнтаў у галіне традыцыйнай культуры, этнаграфіі, фальклору, міфалогіі Беларусі, якія вывучаліся на папярэдніх курсах.

Параўнанне традыцый розных народаў дасць магчымасць зразумець унікальнасць уласнай культуры і, разам з тым, зразумець агульнасць прасторы культуры, агульныя асновы светапогляду людзей розных краін і народаў. Лекцыйныя матэрыялы і самастойная падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў пашырыць ваш культурны кругагляд, узбагаціць ведамі аб культурнай разнастайнасці народаў свету і будзе спрыяць фарміраванню ўвагі да разнастайнасці культурных набыткаў народаў свету, у тым ліку культуры ўласнага народу. Для творчых спецыяльнасцей студэнтаў гэта дазволіць назапасіць той культурны досвед і багаж, які у наступным дапаможа паспяхова будаваць уласную мастацкую творчасць.

Вусныя традыцыі і выканаўчае мастацтва.

Жанры фальклору, якія адносяцца да вызначэння “вусная традыцыя і выканаўчае мастацтва”, згодна Канвенцыі ЮНЕСКА.

Мастацтва вуснай традыцыі (фальклор) – музычны фальклор (песенная творчасць і танец) і сістэма мастацкіх фальклорных казкавых і няказкавых жанраў. У агульным сэнсе ўвасабляецца як фальклорнае мысленне носьбітаў традыцыі.

Фальклор як комплекс славесных, славесна-музычных, музычна-харэаграфічных, гульневых і драматычных відаў творчасці: вустнапаэтычная творчасць, народная музыка, народная харэаграфія, народнае драматычная творчасць. Да жанраў фальклору адносяцца: абрадавая паэзія, замовы, народная проза, балады, прымаўкі і прыказкі, загадкі, песенная лірыка, прыпеўкі, інструментальная музыка, народны тэатр.

Іншы класіфікацыі фальклору: абрадавы фальклор, фальклор каляндарна-абрадавы, фальклор сямейна-абрадавы, празаічныя жанры фальклору, пазаабрадавы фальклор, малыя жанры фальклору, дзіцячы фальклор, народныя гульні.

Канвенцыя 2003 г. падкрэслівае важнае значэнне мовы для захавання і існавання нематэрыяльнай культурнай спадычыны. Пытанні ўзаемасувязі мовы і культуры. Мова – найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі. З мовай у значнай ступені звязана інтэлектуальнае развіццё асобы. Чалавечая мова ператварае біялагічную істоту чалавека ў сацыяльную.Нацыянальная мова складваецца ў перыяд ператварэння народнасці ў нацыю, паколькі нацыя характарызуецца найперш агульнасцю мовы. Нацыянальная мова кансалідуе людзей у нацыю, з’яўляецца сродкам вусных і пісьмовых зносін нацыі. Акрамя стасункаў унутры нацыі, існуе патрэба і ў мове міжнацыянальных зносін і замежных мовах, паколькі мовы народаў свету з’яўляюцца скарбніцай ведаў і вопыту чалавецтва.

Знаёмства з прыкладамі з Рэпрэзентатыўнага спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

“Сільба Гамера” – свісцяшчая мова на выспе Гамера, Канарскія высаы (2009). Першапачаткова мова свісту была заснавана на мове гуанчаў, якія зараз жа выкарыстоўваюць яе высвістваюць словы іспанскай мовы. Жыхары маюць зносіны на ім праз глыбокія цясніны і вузкія даліны, якімі парэзаны ўся выспа. Рэха скажае гучныя гукі ў гарах. Перакрыкваецца пастухам (і не толькі пастухам) у цяснінах немагчыма з-за рэха, але свіст дазваляў даносіць інфармацыю да суразмоўцы. З дапамогай свісту можна размаўляць на адлегласці да трох кіламетраў. У мове сильбо-гамера стабільна вылучаюцца 4 галосных і 8 зычных гукаў. Даданне сыходнага тону пашырае лік зычных да 10. У канцы XX стагоддзя, калі гэтая мова апынулася на мяжы знікнення, мясцовыя ўлады ўвялі вывучэнне сильбо гамера ў школах. У школе на востраве Гамера ўрокі мовы свісту з’яўляюцца абавязковымі для ўсіх . Мова “Сільба Гамера” - адзіная, якая добра вывучана і выкладаецца ў школе, а таму выкарыстоўваецца сотнямі людзей. Яна з’яўляецца важным элементам нацыянальнай самасвядомасці. Дасягненні народа, нацыі ў развіцці навукі, мастацкай літаратуры і іншых галін духоўнай культуры ажыццяўляюцца пры дапамозе род-най мовы. Вось чаму кожны народ імкнецца, развіваючы сваю

нацыянальную культуру, падтрымліваць і ўдасканальваць нацыянальную мову.

Вядомыя прыклады іншых моў гэтага тыпу - напрыклад, на грэцкай выспе Эвіа, у горадзе Кускай у Турцыі, а таксама ў французскіх Пірэнэях.

Выканальніцкія мастацтва - адзін з відаў мастацка-творчай дзейнасці, фальклору, да якіх у галіне нематэрыяльнай культурнай спадчыны прынята адносіць: народные спевы, танец, музыку, нарожны театр.

Прыклад з Рэпрезентатаўнага спіса ЮНЕСКА. Балтыйскае свята песні, якое аб’ядноўвае тры краніны: Латвію, Літву, Эстонію (2008).

Балтыйскія святы песні і танца праводзяцца кожныя пяць гадоў (у Літве кожны чацвёрты год) і з’яўляюцца ўрачыстым завяршэннем шырокага агляду дасягненняў народнага харавога мастацтва, на якое з’язджаюцца найлепшыя харавыя калектывы краін, якія перамаглі ў рэгіянальных конкурсах.

Гісторыя узнекнення звязана з шматгадовай традыцыя ў грамадскім і культурным жыцці латышскага народа. У пачатку XIX стагоддзі ў гарадах Латвіі па нямецкім узоры сталі фармавацца хоры і песенныя калектывы. У 1857 годзе ў Таліне і 1861 годзе ў Рызе прайшлі маштабныя фестывалі нямецка-балтыйскіх хароў. Пачатак святу быў пакладзены ў 1873 годзе - Уселатвійскае свята спеваў. У дні свята (больш за тыдзень) у Рызе праходзяць розныя святочныя мерапрыемствы, якія ахопліваюць яе вуліцы, плошчы і паркі. Колькасць выступоўцаў вылічаецца дзясяткамі тысяч. Так, у свяце 2018 года прынялі ўдзел 43 тысячы ўдзельнікаў.

Беларуская нематэрыяльная культурная спадчына ў гэтай галіне: Мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых песень аўтэнтычнымі фальклорнымі гуртамі “Журавушка”, “Глыбокія крыніцы”, “Павалякі” (вв. Ямінск, Закальное, Вобчын, Любанскі р-н, Мінская вобл.).

Музычна-этнаграфічныя гурты – носьбіты адметнага выканальніцкага стылю і мясцовага ўнікальнага песеннага рэпертуару, прэзентуюць песенныя традыцыі аднаго арэала ў паўночнай частцы Беларускага Палесся, але пры гэтым маюць яўныя адрозненні песеннай культуры. У рэпертуары гуртоў знаходзяцца старажытныя ўзоры песень каляндарнага і сямейна-радавога цыклаў, пазаабрадавая (гістарычна больш позняй традыцыі), сучасная песнятворчасць і, нават, танцы. Лакальная спецыфіка выканальніцкага стылю гуртоў найбольш ярка раскрываецца на прыкладзе каляндарных і вясельных песень. Пры іх выкананні спявачкамі захоўваецца сфарміраваны стагоддзямі этнафанічны комплекс сродкаў: тэмбрава-дынамічная яскравасць, зычная напружаная падача гуку.

Сутнасць гетэрафаніі зводзіцца да таго, што пры выкананні адной і той жа мелодыі некалькімі галасамі ў адным ці некалькіх галасах час ад часу ўзнікае адгалінаванне ад асноўнага напеву. Тэксты песень гуртоў захоўваюць мясцовы лексічны і музычны дыялект, непаўторнасць моўных гаворак Любаншчыны. Гуртавому гучанню ўласціва насычаная гетэрафонная фактура са шчыльнай пераплеценасцю галасоў, тэмбравая цэльнасць. Вясельныя песні вызначаюцца стылёвай маналітнасцю старажытных рытуальных інтанацыйных практык. У в. Абчын і Закальнае пашырана дыяфанія на бурдоннай аснове. У в. Ямінск спалучэнне галасоў у гурте адзначанае вялікай спантаннасцю. Пры выкананні пазаабрадавых песень (пакосных, «гасцявых», казацкіх, любоўных і інш.) характэрна для ўсіх гуртоў адасабленне партый ніжняга і верхняга галасоў. Самабытны выканальніцкі стыль песеннай традыцыі Любаншчыны беражліва захоўваецца і перадаецца ўдзельніцамі гуртоў.

Іншыя прыклады выканальніцкага мастацтва ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей: Танец “Котчынская кадрыля”, в. Котчына Мастоўскага раёна; Казкі і песні Лідзіі Цыбульскай з в. Магільна Уздзенскага р-на;  Песні традыцыйнага вясельнага і хрэсьбіннага абрадаў вёскі Паршына Горацкага раёна і іншыя.

### *Тэма 6. Звычай, абрады, святы*

Традыцыйныя абрады і святы – гэта комплекс сацыякультурных практык беларускага народа, які функцыянуе ў момант іх правядзення.

Класіфікацыя абрадаў: каляндарныя абрады, сямейна-родавыя абрады, аказіянальныя абрады. Каляндарныя абрады як складаны сакральна-магічны комплекс. Кадяндарна-абрадавае кола абрадаў. Зімовы цыкл земляробчага календара. Веснавы цыкл земляробчага календара.

Унікальнасць валачобнага абраду і валачобных песень у традыцыйнай культуры беларусаў. Летні цыкл земляробчага календара. Унікальнасць захаванасці купальскага абраду і песень у традыцыйнай культуры беларусаў. Восеньскі цыкл земляробчага календара. Сямейна-абрадавая творчасць як важнейшая частка народнай культуры. Вясельная абраднасць. Пахавальная і памінальная абраднасць. Аказіянальная абраднасць.

Знаёмства з прыкладамі з Рэпрэзентатыўнага спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

Абрады зімовага цыклу.

Абрад “Уягнуць Каляду на дуба” вёскі Навіна Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці (2012). Захаваўся таксама ў іныз вёсках раёна. Пачынаецца дзея звычайна з упрыгожвання Каляды (у залежнасці ад мясцовых традыцый

гэта альбо кола ад калёс, на якім размяшчаецца сена і гаршчок з куццёю, альбо сноп, альбо барана). Затым вясёлая працэсія кіруецца да высокага дрэва, дзе ўдзельнікам абраду трэба павесіць або пасадзіць Каляду на дуб — ад грому і каб буслы сяліліся. У некаторых вёсках захаваліся звычаі разбіваць палкамі гліняны гаршчок з куццёю так, каб каша разляцелася ў розныя бакі як мага далей — да добрага ўраджаю. Гэта ахвяра прыродным стыхіям і душам продкаў. У асобных мясцовасцях падпальваюць сена і такім чынам клічуць вясну.

Калядная гульня "Жаніцьба Цярэшкі" у Лепельскі раёне Віцебскай вобласці (2009). Пад такой назвай вядома гульня хлопцаў і дзяўчат, якая ўяляе «вяселле» некалькі пар. У калядны вечар хлопцы робіцца «Цярэшкай» і абіраюць сябе «жонку». Традыцыйна ігрышча адбывалася ў карчме, у вялікай хаце. Сэнс маладзёвага ігрышча – справіць жартоўнае вяселле з песнямі, тацамі, жартамі. Абрад быў адроджданы і патрымліваецца сябрамі "Стіудэнцкага аэтнаграфічнага таварыства".

Абрад "Шчадрэц" вёскі Рог Салігорскім раёне Мінскай вобласці (2009) адметны захаванасцю маскі каляднага персанада Дзеда з бяросты, пудзілам Казы і іншым.

Вяснавыя абрады.

Абрад "Тураўскі карагод" на свята Юр'я, вёска Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны і Спіс  нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая патрабуе тэрміновай аховы ЮНЕСКА (2009).

Фальклорна-этнаграфічны гурт вёскі пад кіраўніцтвам Кацярыны Панчэня захаваў у жывой традыцыі абрад на свята Юр'я (6 мая), які паўсюдна на Тураўшчыне называецца "Карагод" і з'яўляецца этнічнай адметнасцю жыхароў гэтага рэгіёна. У гэты дзень адбываецца выхад з абрадавай дзеяй у поле, дзе пасеяна азімае жыта ці пшаніца. Мясцовая асаблівасць у тым, што гэтую дзею праводзяць жанчыны і дзяўчаты, следам за якімі ідуць хлопцы. У поле нясуць на граблях зялёны (сімвалізуе жыта ў полі, а таксама дзяўчат, што падрастаюць), з поля – чырвоны (знак сонца і радасці, знак кроўнай роднасці жанчын аднаго роду). Фарухі – асноўную атрыбутыку абраду нясуць сталыя мужчыны, што заслужылі павагу сярод людзей. Абрад мае характар ўзроставай ініцыяцыі: дзяўчат, якія дасягнулі палавой спеласці, жанчыны далучаюць да свайго кола. Раней пасля абраду на Юр'я гэтыя дзяўчаты павінны былі пастаянна насіць фартухі.

Абрад шматгадова падтрымліваецца кафедрай этналогіі і фальклора, кафедрай нарожных спеваў і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. У 2022 г. ў в. Пагост адбыўся летнік для стедэнтаў і моладзі па перайманню мясцовай фальклорна-абрадавай традыцыі.

Традыцыя памінання продкаў аграгарадка Раздзялавічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці (2016). Традыцыя ўяўляе сабой як калектыўны, так і асабісты зварот да продкаў з мэтай іх ушанавання, просьбай лепшага жыцця, здароўя блізкім і родным, добрага ўраджаю, аховы ад розных магчымых катаклізмаў.  Напрацягу года на могілкі "будзіць продкаў" ходзяць тройчы: на другі дзень Вялікадня, на Успенне, на Дзяды (восеньскія). На другі дзень Вялікадня сем'і збіраюцца зранку за агульным сняданнем з малітвай, збіраюць торбу з традыцыйнай вялікоднай ежай і атрыбутамі: для памерлых жанчын роду бяруць загадзя падрыхтаваны вышыты фартушок, мужчынам – вышыты ручнічок, малым дзецям – стужкі. Прыходзяць на могілкі, звоняць у званіцу, "будзяць памерлую радню" і абыходзяць усіх сваіх родных, каля кожнай магілкі праліваючы салодкую ваду і пакідаючы вялікодныя прысмакі. Пасля наведвання збіраюцца ў хаце аднаго з роду і працягваюць свята ўспамінаючы тых, каго наведалі.

Аказіянальныя абрады.

Абрад «Наўскі Вялікдзень», вёска Аброва Івацэвіцкага раёна Брэсцкая вобласці (2010). Арочны абрад з "абыдзённы ручнік" і абыход хрэсным ходам двароў з праводзіцца штогод у чацвер Велікоднага тыдня. Ён належыць да так званых «заветных празнікаў» ці аброчных дзён, свят, якія былі ўстаноўлены як падзяка або аброк Богу за дапамогу жыхарам вёскі пры ўзнікненні эпідэмій, мору, засухі і інш. Першапрычынай жа ўстанаўлення свята ў Аброва з'явілася збаўленне вёскі ад хваробы і смерці дзяцей. Тады, каб выратаваць сваіх дзяцей, жыхары вырабілі за адну ноч аброчны ручнік і разам з іконай Божай Маці здзейснілі хрэсны ход вакол вёскі, пасля чаго хвароба адступіла. З той пары ў чацвер на велікодным тыдні абраз Маці Божай – Храніцелькі аброўскай, у спецыяльнай хатцы (ківоце) выносіцца з Міхайлаўскай царквы і разам з харугвамі і крыжам "абыходзіць" у святочнай працэсіі двары вёскі.

; абрад "Ваджэньне стралы", вёска Казацкія Балсуны, Веткаўскі раён; дзіцячы калядны абрад Куры Клічаўскага раёна.

## *Тэма 7. Веды і звычаі, датычныя прыроды і Сусвету*

Веды і звычаі, датычныя прыроды і Сусвету – агульная характарыстыка. Людзі заўсёды імкнуліся зразумець прыроду, будавалі карціну навакольнага свету ў адпаведнасці з тымі ведамі, якія мелі. Гісторыя чалавецтва – гэта гісторыя спасціжэння прыроднага навакolля і пошук спосабаў сужыцця ў ёй. Значэнне экалогіі і экалагічных ведаў у сучасным свеце. Узрастанне іх значэння для выжывання чалавецтва. Значнасць

традыцыйных практык, ведаў і навыкаў, датычных прыроды і Сусвету як нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Знаёмства з прыкладамі з Рэпрэзентатыўнага спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

Андская сістэма касмабачання Калавайя, Балівія (2003). Гісторыя этнічнай групы Калавайя, узыходзіць да даінскага перыяду. Як і ў многіх аспектах андскай культуры, у звычаях і каштоўнасцях Калавайя традыцыйныя мясцовыя вераванні спалучаюцца з хрысціянствам. Асноўная дзейнасць Калавай звязана з практыкай лекарства, сакрэты якога перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Розныя абрады і цырымоніі, звязаныя з гэтай практыкай, фарміруюць мясцовую эканоміку. Андская сістэма касмабачання Калавайя ўяўляе сабой спалучэнне міфаў, рытуалаў, каштоўнасцей і праяў форм культуры. Дадзеная практыка лячэння грунтуецца на сістэме вераванняў карэннага насельніцтва Анд, і прызнана не толькі ў Балівіі, але і ў шматлікіх краінах Паўднёвай Амерыкі, дзе жрацы Калавайя выступаюць у якасці лекараў. Гэты від лекарства грунтуецца на глыбокім разуменні жывёльнай, мінеральнай і раслiннай фармакапеі, а таксама на рытуальных ведах, цесна звязаных з рэлігійнымі вераваннямі. Лекарствам займаюцца выключна мужчыны, якія вядуць вандроўны лад жыцця, гэта садзейнічае абмену вопытам і набыццю новых ведаў. Знаёмячыся з рознымі экасістэмамі свету, лекары Калавайя атрымліваюць веды аб розных лекавых раслінах. Фармакапея Калавая, якая налічвае каля 980 відаў раслін, з'яўляецца адной з самых каштоўных у свеце.

Беларуская нематэрыяльная культурная спадчына ў гэтай галіне.

Культ крыніц і камянёў на Беларусі. Вытокі культу і сучасныя практыкі шанавання гэтых прыродных сакральных аб'ектаў.

Абрад «Бразгун» і яго складовы элемент - ушанаванне іконы святых Пятра і Паўла, вёска Наркі, Чэрыкаўскі раён Магілёўскай вобласці. Абрад цікавы тым, што спалучыў у сабе элементы язычніцтва (пакланенне крыніцы) і хрысціянства (шанаванне іконы Пятра і Паўла). Адметны і той факт, што крыніца пачала біць менавіта ў дзень гэтых святых і лічыцца абярэгам вёскі.

Ушанаванне "Галубой крыніцы", Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці (2010). Традыцыя ўшанавання і паломніцтва да гэтай крыніцы звязана са святам Мядовы Спас, які называюць у народзе Макаўе ці Макавей (дзень святых мучанікаў Макавеяў 14 жніўня), звязана з ушанаваннем Жыватворнага Крыжа Гасподня, Божай Маці і святых пакутнікаў сямі братоў Макавеяў. Тут у 992 г. прымала хрысціянства племя радзімічаў. Паломніцтва да Блакітнай крыніцы дасюль застаецца актуальным, бытуе ў актыўнай форме і з'яўляецца самым масавым на Магілёўшчыне. Тут збіраюцца шматлікія паломнікі, каб прыняць удзел у святкаванні. Сярод іх практычна

ўсе жыхары в. Кліны, навакольных вёсак, Слаўгарада, суседніх раёнаў і нават прымежных тэрыторый Расіі і Украіны. Паломнікі ідуць Хросным ходам да крыніцы, слухаюць святочны вадасвятны малебен, запальваюць свечы, а пасля акунаюцца ў гаючую ваду, набіраюць яе з сабой. Паломніцтва да "Блакітнай крыніцы" і свята 14 жніўня з'яўляюцца шырокамаштабнай культурнай з'явай. З года ў год яна прыцягвае ўвагу не толькі мясцовай супольнасці, якая лічыць гэту традыцыю сваёй нематэрыяльнай культурнай каштоўнасцю, передае яе ад пакалення да пакалення, але і для насельнікаў іншых рэгіёнаў Беларусі і суседніх краін. Сама крыніца – цікавы і незвычайны прыродны аб'ект. Вада ў ёй мае пастаянную тэмпературу + 8º С, не замярзае зімой і не награваецца ўлетку.

Традыцыі шанавання Святога каменя ў в. Крамянец Лагойскага раёна Мінскай вобласці (2014). Жыхары в. Крамянец называюць камень Святым і ходзяць да яго раніцай у першы дзень Вялікадня, на Сёмуху, Яблычны Спас, Пакроў, прыносячы дары ў выглядзе традыцыйных абрадавых страў, грошы і інш. Дзве вялікія авальныя лункі на камені называюць "божымі слядамі", вада ў іх пасля дажджу лічыцца святой, ёю лечацца. Кажуць, што найбольш вада ў іх дапамагае ад хвароб вачэй. Абракаюцца ля каменя ў любы час. Некаторыя ходзяць да яго ў нядзелю, чыста апрануўшыся, як у царкву. Многія, ідучы ў лес і з лесу, пакідаюць ля яго частку назбіраных грыбоў або ягад, кветкі. Цяпер камень наведваюць і падчас сямейных урачыстасцяў – маладыя пасля вяселля, госці імяninніка ў дзень яго нараджэння, у іншых выпадках. У засуху ўдовы выклікаюць дождж, адкаціўшы з-пад каменя каменьчыкі і, падважыўшы камень на вялікіх калах у рост чалавека, пакідаюць іх уваткнутымі ў зямлю пад каменем. Лічыцца, што не пазней, як на трэці дзень, пойдзе дождж. Калі ён ужо не патрэбны – калы вынімаюць і дробныя каменьчыкі падкочваюць на месца пад камень.

Мясцовая супольнасць лічыць камень сваёй святыняй, старэйшыя жыхары далучаюць да практыкі шанавання дзяцей і ўнукаў, такім чынам перадаючы традыцыі ў сям'і. Існуе і пераемнасць сярод дарослых жыхароў супольнасці: да каменя пачынаюць хадзіць людзі, што пераехалі ў Крамянец ужо ў сталым узросце, да рытуалу выклікання дажджу далучаюцца маладыя ўдовы, якія, пакуль муж быў жывы, не хадзілі да каменя.

Аброчны абрад "Каменныя дзевачкі" Лельчыцкі раён Гомельскай вобласці (2017) – унікальны абрад ушанавання каменных крыжоў, у аснове яго ляжыць міфалагічнае паданне аб праклёне маці сваёй дачкі, якая ператварылася ў камень.

Іншыя галіны народны ведаў ў галіне прыроды.

Традыцыйная кухня – сістэма ведаў аб харчаванні беларусаў, кулінарных традыцый і рытуалаў, звязаных з харчаваннем.

Народная медыцына – рэлігійна-магічная практыка і вераванні людзей адносна здароўя чалавека і сродкаў лекавання. Перадпасылкамі ўзнікнення ведаў па народнай медыцыне з’яўляліся міфалагічныя ўяўленні людзей, таму грунтуюцца на эмпірычным вопыце.

### *Тэма 8. Веды і навыкі, звязаныя з традыцыйнымі рамёствамі*

Традыцыйныя рамёствы як комплекс ведаў і тэхналагічных прыёмаў і навыкаў, які складаецца з наступнага:

Матэрыялы

Прылады працы

Артефакты (вырабы)

Майстар

Комплекса ведаў, тэхналагічных прыёмаў, навыкаў, майстэрства.

Традыцыйныя тэхналогіі вырабаў (рамёствы) – сістэма ведаў аб традыцыях, а таксама апісанне тэхналогій традыцыйных рамёстваў і промыслаў. Выяўляюцца праз выключныя лакальныя традыцыі вытворчасці, скіраваныя на задавальненне патрэб людзей у побыце, а таксама эстэтычна-мастацкай практыцы.

Знаёмства з прыкладамі з Рэпрэзентатыўнага спіса нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

Інданезійскі крыз – кінжал (2009). Крыс, або Кэрыс - гэта інданэзійскі кінжал з пламепадобным клінком. Лічыцца, што, з’уляючыся адначасова зброяй і святым прадметам, крыс валодае магічнай сілай. Найстаражытнейшыя з знойдзеных пацукоў ставяцца да X ст. У крыза тонкае лязо з шырокай, асіметрычнай падставай. Похвы, як правіла, зроблены з дрэва, але сустракаюцца асобнікі са слановай косткі і нават з золата.

Крыс валодае эстэтычнай каштоўнасцю дзякуючы форме і дызайну ляза (іх налічваецца каля 40 варыянтаў), узору з металу, які ўпрыгожвае лязо (прыкладна 120 варыянтаў). Каваль вырабляе лязо з пластоў жалезаруднай сыравіны і метэарытнага жалеза. Кавалі карыстаюцца вялікай павагай у грамадстве за свае веды ў галіне літаратуры, гісторыі і акультных навук.

Крыс - сямейная рэліквія, перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Крысы носяць як мужчыны, так і жанчыны. Гэтая зброя ахутана арэолам таямнічасці і мноствам міфаў. Да яго звяртаюцца як да магічнага талісмана, зброі, святой сямейнай рэліквіі, а таксама ён служыць дадаткам да экіпіроўкі салдат пры двары, аксэсуарам цырыманіяльнага адзення, паказчыкам сацыяльнага статусу і сімвалам доблесці.

Выраб крыжоў і іх сімволіка ў Літве (2004). Майстэрства вырабу крыжоў і алтароў з’яўляецца шырока распаўсюджанай традыцыяй, нараўне з

асвячэннем крыжоў і іншымі рытуаламі, якія да іх адносяцца. Выразаныя з дуба крыжы звязаны з каталіцкімі цырымоніямі і святамі, напрыклад, прысвечанымі збору ўраджаю. Яны заклiканы дапамагаць людзям у бядзе. Крыжы звычайна размяшчаюцца на абочынах дарог, на ўездах у вёскі, побач з помнікамі і на могілках. Калі просяць у іх багацця, то звычайна робяць дары ў выглядзе прадуктаў харчавання, пацерак, грошай, каляровых шалікаў (напрыклад, вясельных) ці фартухоў. Крыжы таксама сталі месцам збору людзей у вёсках і сімвалам яднання абшчыны.

Самае знакамітае месца, якое сімвалічна ўвасаблія традыцыю нанавання і вырабу крыжоў ў Літве – Гара крыжоў, якая знаходзіцца каля г. Шаўляй.

Беларуская нематэрыяльная культурная спадчына ў гэтай галіне.

Майстэрства шапавалаў на Дрыбіншчыне. Творчасць майстроў-шапавалаў Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці адметна майстэрскім валоданнем унікальнай і рэдкай тэхналогіяй -валяння з лямцу валёнак, магерак. Валяльны промысел здаўна распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі. На Магілёўшчыне захаваліся невялікія асяродкі патомных майстроў валяльнай справы, ці «шапавалаў» (лакальная назва), якія практыкуюць выраб валёнак, шапак-магерак, брылёў і інш. Адным з такіх асяродкаў з’яўляецца Дрыбінскі раён. Менавіта валянне шапак і дало саматужнікам назву «дрыбінскія шапавалы». Адным з такіх асяродкаў з’яўляецца Дрыбінскі раён. Менавіта валянне шапак і дало саматужнікам назву «дрыбінскія шапавалы». Сёння на Дрыбіншчыне працуе больш за дзясятак майстроў-шапавалаў, якія захоўваюць і перадаюць рамяство сваім пераемнікам.

У запісах беларускага этнографа Е.Р. Раманава адзначаецца, што шапавальства на Дрыбіншчыне ўзнікла на пачатку XVIII ст. Здаўна майстры карыстаюцца сваёй сакрэтнай мовай, якая атрымала назву «катруш-ніцкі лемязень». Выпрацавана яна была, каб трымаць у сакрэце прыёмы рамяства. Сёння лексічны склад таямнічай мовы шапавалаў налічвае 915 слоў.

Традыцыя роспісу велікодных яек г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці. Старажытнейшы від роспісу. Уваходзіць у абрад святкавання Вялікадня, прымеркаванага да народных веснавых свят. Для роспісу выкарыстоўваецца спецыяльны самаробны інструмент – “шпілька” – палачка з цвічком у тарцы, пчаліны воск, натуральны фарбавальнік чорна-карычневага колеру з настою кары дуба, альхі, альховых шышак і ржавага жалеза. Мясцовыя жыхары вельмі ганарацца і берагуць гэту старажытную традыцыю. У а.г. Сапоцкі створана музей “Сапоцкінская пісанка”, які падтрымлівае, вывучае і папулярызуе мясцовую традыцыю.

Навагрудская выці нанка-выбіванка (2014). Адметная тэхніка “выбівання” пэўнага малюнку на паперы з дапамогай спецыяльных

інструментаў: долата, расплюшчанага цвіка, металічнай трубачкі (пустой гільзы), вострай алюміневай трубачкі. Асновай такіх вырабаў з’яўляецца ромбавідная сетка, якая імітуе сабой ячэйкі гардзіннага палатна, вязанага з нітак. На ёй размяшчаюцца сіметрычныя буйныя кветкі або букеты, а па краях выбіваюцца зубчыкі паўмесяцам або вугольнікамі.

Папяровымі ўзорамі, створанымі ў тэхніцы выцінанкі-выбіванкі ўпрыгожвалі інтэр’еры жытла ў некаторых вёсках на Навагрудчыне ў 1930-1950 гг. ХХ ст. Выраблялiся яны адзінкавымі майстрыхамі, якія пакінулі след у памяці аднавяскоўцаў, і праз гады іх мастацтва стала асновай для аднаўлення традыцыйнай навагрудскай выцінанкі-выбіванкі, якая на некаторы час была страчана. Аднавіла гэты ўнікальны від выцінанкі Ніна Пятроўна Шурак.

Традыцыйныя тэхналогіі ткацтва – найбольш распаўсюджаны ў Беларусі адзін з відаў тэкстыльных рамёстваў, які ўвасабляе ў сабе не толькі традыцыйныя веды і навыкі, але і светапогляд беларускага народа. Да тэкстыльных рамёстваў этнолагі адносяць: ткацтва, вязанне, пляценне, вышыўку, прадзенне, карункапляценне.

Традыцыі закладнога ткацтва чырвона-белых ручнікоў вёскі Семежава Капыльскага раёна. Традыцыі закладнога ткацтва ў вёсцы Семежава захаваліся з даўніх часоў. Выкарыстоўвалася да 1980-х гадоў. Вядома больш за 20 узораў, вытканых мясцовымі майстрыхамі ўручную. Цяпер традыцыі працягваюць у школе ткацтва, створанай у Семежаве па сумесным праекце ЕС і ПРААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні».

Прыклады нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў галіне ведаў і навыкаў, звязаных з традыцыйнымі рамёствамі, бадай самыя шматлікія па колькасці ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: Творчасць народнага майстра М. Тарасюка, вёска Стойлы, Пружанскі раён; тэхналогіяй стварэння майстрамі Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці драўляных музычных народных інструментаў; тэхналогія пляцення лапцяў у Дрыбінскім раёне, якую аднавілі па аўтэнтычных узорах і іншыя.

### *Тэма 9. Ахова і захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў сучасных умовах*

Знікненне тысячагадовых традыцый, згасанне традыцыйных форм гаспадарання, забыццё традыцыйнай культуры розных народаў і этнасаў выклікала неабходнасць прыняцця з боку міжнароднай супольнасці неадкладных мер па захаванні і трансляцыі традыцыі.

Галоўнай умовай бытавання, функцыянавання і трансляцыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў сучасным грамадстве з’яўляецца традыцыя як сістэма, здольная да самаразвіцця (саматрансляцыі), і засваення новымі пакаленнямі аб’ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны мінулага, а таксама пераемнасць пакаленняў, якая наладжвае сувязь паміж мінулым і сучасным. Такім чынам, адной з асноўных задач, якая была вылучана даследчыкамі XXI стагоддзя, з’яўляўся пошук найбольш аптымальных шляхоў захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, вырашэнне пытанняў па актуалізацыі і трансляцыі яе ўзораў. Галоўным звяном тут з’яўляецца пераемнасць, якая наладжвае сувязь паміж мінулым і сучасным.

Важным напрамкам дзейнасці ў гэтай галіне з’яўляецца ідэнтыфікацыя, фіксацыя і дакументаванне элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Гэты дзейнасць у нашай краіне забяспечана метадычна выданнем “Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны” : Практычнае кіраўніцтва / А. Сташкевіч [і інш.]. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2013. — 164 с. : іл. Выданне прысвечана практыцы ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Яно падрыхтавана ў строгай адпаведнасці з прынцыпамі Міжнароднай канвенцыі аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003 г.) і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Утрымлівае метадычныя рэкамендацыі для супольнасцей, груп носьбітаў спадчыны, розных культурных інстытуцый і няўрадавых арганізацый, устаноў адукацыі, музеяў, дамоў рамёстваў і фальклору, дзяржаўных органаў кіравання культурай, экспертаў і іншых зацікаўленых асоб, якія ўключаны ў працэс ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны і садзейнічаюць яе захаванню і папулярызацыі

Праблема аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны цесна звязана з агульнымі працэсамі нацыянальнай і лакальнай ідэнтыфікацыі, якія адбываюцца ў грамадстве. Лакальным супольнасцям належыць важная роля ў захаванні адметнасцей лакальный культуры, нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Набывае вялікую значнасць развіццё мясцовых ініцыятыў у гэтай галіне.

Паняцце “супольнасць” у сучасным сэнсе хутчэй паказвае на сацыяльную згуртаванасць, узаемадзеянне, прыналежнасць, блізкасць інтарэсаў. Супольнасці могуць быць звязаны разнастайным сацыяльным і культурным вопытам, сегментаваныя па розных крытэрыях - аб'ектыўных (этнічная прыналежнасць, мова, месцазнаходжанне, сацыяльныя сувязі) або суб’ектыўных (самаідэнтыфікацыя, салідарнасць). Удзел супольнасці ў ахове

сваёй нематэрыяльнай культурнай спадчыны – гэта мабілізацыя яго членаў вакол спадчыны і здольнасць узяць адказнасць за яго. Аднак сучасныя супольнасці па сваёй прыродзе неаднародныя. У кожнай супольнасці прысутнічаюць розныя сацыяльныя пласты і сувязі. У супольнасці таксама існуюць прамыя носьбіты і практыкі, тыя, хто яго захоўвае і ўвесь час практыкуе, але ёсць і тыя, хто не з'яўляецца актыўнымі практыкамі, але з энтузіязмам падтрымлівае іх і з'яўляецца прапагандыстамі спадчыны.

На мясцовых суполнасцех у значнай ступені ляжыць адказнасць за пераемнасць лакальных традыцый, стварэнне механізму яе перадачы наступным пакаленням.

Нематэрыяльная культурная спадчына ўяўляе багаты турыстычны патэнцыял. У кожнай вобласці вылучаецца пэўная колькасць нематэрыяльных каштоўнасцей, турыстычны патэнцыял якіх выкарыстоўваецца найбольш актыўна. У цэлым па краіне 52% нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей мэтанакіравана ўключаны ў розныя формы турыстычнай дзейнасці. Цікавыя, прывабныя для турыстаў ініцыятывы можна знайсці ў кожнай вобласці. Найбольш эфектыўнымі яны становяцца пры аб'яднанні розных відаў мясцовай спадчыны для прадстаўлення цэласнага вобраза традыцыйнай культуры. Утварэнню турыстычна-прывабных асяродкаў народнай спадчыны спрыяе цеснае супрацоўніцтва ўстаноў культуры, адукацыі, спорту і турызму, мясцовых органаў улады, міжнародных праграм падрымкі. Турызму спрыяе жыццядзейнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны і ўстойліваму развіццю адпаведных тэрыторый

Патэнцыял нематэрыяльнай культурнай спадчыны для развіцця культурна-пазнавальнага турызму пакуль што ў нашай крыяне не выкарыстаны ў поўнай ступені. Шматлікія прыклады выдатных мясцовых ініцыятыў і раённых мерапрыемстваў паказваюць, што пры творчым падыходзе ўстаноў культуры да работы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай яе рэсурсы могуць быць выкарыстаны для развіцця адметных культурных праектаў і брэндавых мерапрыемстваў, якія садзейнічаюць захаванню культурнай разнастайнасці і ўмацаванню супольнасцей носьбітаў беларускай традыцыйнай культуры.

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

Семінарскія заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да сварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме.

### *Семінар 1.* Дакументы ЮНЕСКА і міжнародная практыка па ахове НКС

Мэта семінара – азнаёміцца з тэкстам Канвенцыі, зразумець яе ідэю, канцэпцыю і засвоіць асноўныя паняцці і азначэнні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Студэнт павінен прачытаць тэкст Канвенцыі, заканспектаваць яе асноўныя палажэнні, з тым, каб адказаць на асноўныя пытанні, якія вынесены на абмеркаванні падчас семінара. На пытанні 3 і 4 неабходна знайсці ў сетцы Інтэрнет адпаведныя прыклады з нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

*Пытанні да семінару:*

1. Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003): канцэпцыя, асноўная праблематыка, структура дакументу.
2. Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны на міжнародным узроўні: кіраванне, крыніцы.
3. Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.
4. Спіс элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія падлягаюць ахове.
5. Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны на нацыянальным узроўні: кіраванне, грамадскія ініцыятывы, нацыянальны рээстр элементаў і аб’ектаў НКС.

Літаратура

1. Конвенция об охране нематериального культурного наследия ЮНЕСКО, 17 октября 2003 г. - [Электронны рэсурс]. – Рэжым даступа: http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/cultural_heritage_conv.sh

tml. - Дата доступа: 18.09.2012.

2. Шылова, О.Е. Роль ЮНЕСКО в охране нематериального культурного наследия [Электронны рэсурс].

3. Сташэўская, С.К. Ключавыя этапы станаўлення паняцця «нематэрыяльная культурная спадчына» / С.К. Сташэўская // Зборнік дакладаў і тэзісаў VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў» (Мінск, Беларусь, 24–25 лістапада 2016 года) : у 2 т. /гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – Т. 1. – 504 с. С.824 – 830.

4. Смолік, А.І. Нематэрыяльная курная спадчына: да праблемы станаўлення культуралагічнай катэгорыі А.І. Смолік // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. - 2009. - № 1. – С. 32 – 38.

***Семінар 2. Нематэрыяльная культурная спадчына ў галіне вуснай традыцыі***

1. Презентацыя і аналіз вусных традыцый народаў свету ў якасці носьбіта НКС (3 прыклада).
2. Презентацыя і аналіз вусных традыцый ў якасці носьбіта НКС ў Беларусі (3 прыклада).
3. Агульнае і асабліваe ў НКС ў галіне вуснай традыцыі народаў свету і беларусаў.

Падрыхтаваць мультымедыйныя прэзентацыі, аўдыя і відэа па матэрыялах сеткі Інтэрнэт і сайта “Жывая спадчына Беларусі”.

***Семінар 3. Нематэрыяльная культурная спадчына ў галіне выканаўчага мастацтва***

1. Выканаўчае мастацтва народаў свету ў якасці носьбіта НКС ў свеце (3 прыклада).
2. Выканаўчае мастацтва ў якасці носьбіта НКС ў Беларусі (3 прыклада).
3. Агульнае і асабліваe ў НКС ў галіне выканаўчага мастацтва народаў свету і беларусаў.

Падрыхтаваць мультымедыйныя прэзентацыі, аўдыя і відэа па матэрыялах сеткі Інтэрнэт і сайта “Жывая спадчына Беларусі”.

***Семінар 4. Нематэрыяльная культурная спадчына ў галіне ведаў і звычаяў, якія датычацца прыроды і Сусвету***

1. Веды і звычаі аб прыродзе і Сусвеце народаў свету ў якасці носьбіта

НКС ў свеце (3 прыклада).

2. Веды і звычаі аб прыродзе і Сусвеце ў якасці носьбіта НКС ў Беларусі (3 прыклада).
3. Агульнае і асаблівае ў НКС у галіне ведаў і звычаяў, звязаных с прыродаў, народаў свету і беларусаў.

Рекамендавана падрыхтаваць мультымедыйныя прэзентацыі, аўдыя і відэа па матэрыялах сеткі Інтэрнэт і сайта "Жывая спадчына Беларусі" (см. спіс літаратуры).

.

***Семінар 5. Нематэрыяльная культурная спадчына ў галіне традыцыйных рамёстваў***

1. Традыцыйныя рамёствы народаў свету ў якасці носьбіта НКС ў свеце (3 прыклада).
2. Традыцыйныя рамёствы ў якасці носьбіта НКС ў Беларусі (3 прыклада).
3. Агульнае і асаблівае ў НКС у галіне традыцыйных рамёстваў народаў свету і беларусаў.

Рэкамендавана падрыхтаваць мультымедыйныя прэзентацыі, аўдыя і відэа па матэрыялах сеткі Інтэрнэт і сайта "Жывая спадчына Беларусі" (см. спіс літаратуры).

***Семінар 6.*** **Ахова і захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў сучасных умовах**

1. Нематэрыяльная культурная спадчына і лакальныя супольнасці і лакальныя культуры.
2. Развіццё мясцовых ініцыятыў у галіне НКС.
